# Пра краёвасць[1]

**Уладзіслаў Талочка**

Беларуская прэса розных адценняў і кірункаў у апошнія часы шмат прысвячае месца і ўвагі пытанням краёвасці. Адныя разглядаюць яе з пункту гледжання рэальных інтарэсаў, а іншыя спрабуюць тэарэтычна разважаць над самой сутнасцю пытання. Часта праглядаецца вельмі шмат добрай волі ў выстаўленні ўжо зусім канкрэтных пажаданняў да польскай дэмакратыі, якая яшчэ і сёння мае адвагу прызнавацца ў сваёй краёвасці. Акрамя гэтай добрай волі мы, аднак, бачым, што канчатковыя высновы носяць хутчэй адмоўны, чым станоўчы характар. З чаго ж у беларусаў вынікае гэты песімізм?

Факты штодзённага жыцця кажуць самі за сябе. Нягледзячы на вялізную добрую волю і наяўную веру, цяжка правесці дакладны падзел паміж “тутэйшымі” палякамі ды ўсімі іншымі. За дзеянні і паводзіны адміністрацыі ды ўрада адказнасць непазбежна падае і на краёвую польскую грамадскасць, што, верагодна, мае адметнае бачанне як беларускага пытання, так і цэлага шэрагу краёвых спраў у параўнанні з цэнтральнымі ўладамі і большасцю польскага грамадства. Калі б нават лідары беларусаў і ўсведамлялі, што трэба па-рознаму ўспрымаць адных і другіх, то не трэба забывацца, што да масаў яны мусяць прамаўляць так, як гэта цяпер і робяць. Масы не займаюцца філасофіяй і не дыскутуюць над абстрактнымі пытаннямі, яны толькі бачаць, адчуваюць, дзейнічаюць і інстынктыўна рэагуюць на знешнія раздражняльнікі. Трэба прызнаць, што рэакцыя масаў за ўвесь час польскай улады, а асабліва ў апошнія часы, не ішла ў такім кірунку, каб ім можна было б казаць пра супрацоўніцтва з палякамі.

Пытанне для дэмакратычных краёвых груповак сапраўды вельмі цяжкае. Адносна беларусаў трэба было б з удзячнасцю падкрэсліць тое, з чым яны да краёўцаў прыходзяць. Адмаўленне ў іх не абсалютнае, а залежыць ад умоў. Што ж тычыцца гэтых умоў, то яны не аднолькавыя ў розных групоўках. Не пра іх я, аднак, хачу цяпер гава-



[1] Перакладзена паводле: Dryhwicz [Tołoczka, Władysław] (1927). “O krajowości”. *Przegląd Wileński,* № 9 ??.??

рыць. Хачу звярнуць увагу на сам кантэкст гэтай справы і закрануць некалькі момантаў.

Безумоўна, краёвасць на практыцы па-рознаму выглядае ў даваенны час і ў апошнія гады. Тады яна была, магчыма, менш глыбокай, аднак мела вельмі шырокае кола прыхільнікаў. Калі крытэрыем абраць стаўленне (а мне падаецца, што гэтая мерка вельмі дакладная) да беларускай адраджэнскай працы, то выглядае, што краёвасць з моманту ўзнікнення незалежнай польскай дзяржавы недзе знікла. Засталіся адзінкі, ды і яны альбо маўчаць, альбо на нешта адгукаюцца, але таксама заўсёды захоўваюць пэўную стрыманасць. Такія паводзіны даюць падставу шматлікім праціўнікам польска-беларускага паразумення да закідання не толькі нейкіх сваіх домыслаў, але цалкам канкрэтных абвінавачванняў, што польская шчырасць крывадушная, калі гаворыцца пра роўнасць і вольнасць. Гэтае прытворства ў адных было б свядомым, а ў іншых не, але агульным было тое, што яны глядзелі б на беларускі рух толькі як на сродак для аслаблення расійскай небяспекі.

Не праводзячы вялікіх абагульненняў, запытаемся, аднак, ці няма ў такой пастаноўцы пытання вялікай долі праўды?! І падаецца, што, на жаль, мы будзем вымушаныя адказаць на гэтае пытанне станоўча. Ва ўсёй гісторыі ўдзелу палякаў у беларускай працы пераважае летуценны шляхетны элемент – паны, з пункту гледжання сялян. Кажу паны, але паны добрыя, якіх сяляне вельмі любяць і якім цалкам давяраюць. То якраз гэтыя паны-летуценнікі ішлі ў народ, думаючы толькі пра яго, не маючы на ўвазе ніякай уласнай выгады. Такі ўжо ў нас быў агульны дух часу.



Так было напрыканцы дзевятнаццатага стагоддзя. Так пачалося наша стагоддзе. Кансерватыўны спосаб заглядання на вясковыя падворкі па-ранейшаму захоўваўся і ў гарадской інтэлігенцыі, якая кантактавала з сялянствам. Нават 1905 год, які распачаў новую эру ў гісторыі беларускай нацыі (narodu), не выклікаў ніякіх зменаў у гэтым *унутраным стаўленні.* Я падкрэсліваю гэтае паняцце пра ўнутранае стаўленне. І надалей мы бачым вялізную зычлівасць з польскага боку адносна беларускай працы. Часта палякі яшчэ актыўна працуюць на культурных пляцоўках разам з выхадцамі з сялян, колькасць якіх няўхільна расце. Але шэрагі такіх палякаў робяцца ўсё больш рэдкімі. Першапачатковая гармонія пачынае страчвацца. Ціха і негалосна палякі адмаўляюцца ад актыўнай працы. Яны надалей захоўваюць вялікую зычлівасць, але стараюцца пра гэта публічна ўголас не казаць. Так было перад самай вайной.

Вайна, расійская рэвалюцыя, падзеі ў Менску 1917–1918 гадоў выклікалі амаль што поўнае пахаладанне, а ў пэўных польскіх сферах выклікаюць зусім іншае стаўленне (як, напрыклад, у Скірмунта, княгіні Радзівіл).[2] Дзяржаўная незалежнасць толькі завяршыла справу, пачатую раней. І я зноў жа звяртаю ўвагу, што польская дзяржаўнасць – гэта толькі адзін з момантаў у эвалюцыі ўзаемных адносін, пры гэтым момант не адзіны і не выключны.

Віной таму, што мы сёння маем, з'яўляецца памылковае ўспрыманне беларускага руху папярэднімі і сучаснымі нам польскімі пакаленнямі. Тут прысутнічае дух пакутніцтва, які мусіць быць цалкам выгнаны, каб узнікла хуткая магчымасць для ўзаемнага паразумення. Беларускі рух – гэта рух усяго народа, і ягоную падтрымку ды прызнанне трэба праводзіць да самага канца. Быў грэх ягонай недаацэнкі з польскага боку, і трэба гэта прызнаць. Быў ён нават і ў тых, хто ўмеў глядзець на справу не толькі негатыўна, але і пазітыўна, беручы пад увагу інтарэсы самога аб'екта зацікаўленасці.

Другім момантам, які падзяліў сімпатыкаў і актыўных удзельнікаў адраджэнскай працы, было тое, што іх палохаў *радыкалізм*. Так, радыкалізм, нягледзячы на тое, што большасць з гэтых людзей самі ў тэорыі былі больш радыкальныя, чым нават самы прагрэсіўны селянін. Але сялянскі радыкалізм – гэта адно, а шляхецка-інтэлігенцкі – іншае. Я сам з'яўляюся ворагам выключнай ролі сялянства ў беларускім руху і частага нават атаясамлення беларуса з селянінам, бо народ і сялянства – гэта не адно і тое ж. Акрамя таго, ёсць вялікая адметнасць псіхалогіі, можа толькі ў пэўных нюансах інакш настроенай, у сялянскіх масаў і ў шляхты, нават у той, якая знешне ад сялян нічым не адрозніваецца. Засценкі таксама перанялі ад панскіх двароў пэўны светапогляд. Самі палякі пачалі адмаўляцца ад супрацоўніцтва, бо іхняя роля апекуноў завяршалася, а на іншую ролю, чым зычлівага пана ў дачыненні да пачцівага мужычка, яны пагадзіцца не хацелі.

На першы погляд можа падавацца, што такая пастаноўка пытання патыхае анахранізмам, што так магло быць 60–70 гадоў таму, але не

[2] Маецца на ўвазе пазіцыя, занятая пасля рэвалюцыі 1917 года ў дачыненні да беларускага нацыянальнага руху такімі прадстаўнікамі мясцовай польскамоўнай арыстакратыі, як Раман Скірмунт і княгіня Магдалена Радзівіл. Яны не толькі выказвалі свае сімпатыі да беларускай нацыянальнай дзейнасці, але і самі ў яе ўключыліся. Скірмунт адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ўзначаліў створаны ў Менску Беларускі нацыянальны камітэт, а пасля, у красавіку 1918 года – урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Што тычыцца княгіні Радзівіл, то яна аказвала беларускім дзеячам матэрыяльную падтрымку і ўтрымлівала ў сваіх маёнтках беларускамоўныя школы, прытым рабіла гэта яшчэ перад Першай сусветнай вайной. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

сёння. Аднак гэта не так. Псіхалагічная аснова сама сабой хутка не змяняецца, калі свядома да гэтага не прыкласці руку. Такая самакрытыка і крытыка сваіх адносін да бягучага жыцця, хоць і патрабуе намагання, можа быць узнагароджаная добрым вынікам. Выдатным прыкладам нам можа служыць правядзенне крытыкі памылковых поглядаў адносна спачатку ўкраінскага, а апошнім часам літоўскага пытання. Там, магчыма, было нават горш. Там былі цяжкасці, выкліканыя фальшывымі нацыянальнымі амбіцыямі. Жыццё, аднак, вымусіла, нягледзячы на ўсё, прызнаць і паставіцца з пашанай да таго, што ёсць. Прымусіла гэта зрабіць жыццё, знешнія фактары. Адносна ж беларускага пытання гэта яшчэ можа быць дзеяннем добраахвотным і тым самым больш высакародным.

Некалькі дзясяткаў гадоў, ды нават дзясятак-другі таму, нібыта актуальнымі былі дыскусіі на тэму магчымасці існавання літоўскай нацыі (не дзяржавы!!). Пэўная частка польскага грамадства таксама спрыяла адраджэнню літоўскай нацыі, але гэта таксама рабілася па-панску, а не так, як належала. І што з гэтага атрымалася?

А цяпер нават кожны польскі дэмакрат усё яшчэ па-рознаму думае пра супрацоўніцтва з літоўцамі і з беларусамі. Можа, ён таго не гаворыць, але такі ёсць псіхалагічны настрой.

Пакуль будзе захоўвацца такое становішча, усе пачынанні будуць памылковымі ў самым зародку. Краёвасць у нас магчымая! Толькі гэтая краёвасць мусіць грунтавацца на паняцці раўнапраўя ў яго сучасным разуменні, узаемным успрыманні і павазе. У адваротным выпадку ўсялякія спробы асуджаныя на няўдачу і чым далей, тым больш мы ўсе будзем адзін аднаму варожыя.



## *Ад рэдакцыі*

Пан Дрыгвіч даў свайму артыкулу няправільную назву, бо ён у ім гаворыць не столькі пра краёвасць, колькі пра адносіны польскай дэмакратыі ў нашым краі да беларускага нацыянальнага руху.

Нягледзячы на шматразовыя рэдакцыйныя дэкларацыі на тэму краёвай ідэалогіі, падаецца, што яна яшчэ не дастаткова ўсім зразумелая. Таму карыстаемся магчымасцю, каб коратка і выразна сфармуляваць яе галоўныя прынцыпы.

Перш за ўсё мусім выразна запярэчыць супраць атаясамлення краёвага лагера з лагерам мясцовай польскай дэмакратыі. Краёвасць не

звязаная з ніводнай нацыянальнасцю. Краёўцам можа быць як тутэйшы паляк, так і літовец, беларус, нават габрэй, калі ён разумее і адчувае дзяржаўныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. І наадварот – усе яны не будуць краёўцамі, калі інтарэсы сваёй нацыянальнасці ставяць вышэй за агульныя, краёвыя інтарэсы. Розніца толькі ў тым, што літоўцы і беларусы ў любым выпадку *з'яўляюцца бясспрэчным матэрыялам для краёўцаў,* у той час як палякі і габрэі, маючы апору па-за межамі краю, могуць складаць чужы і нават варожы элемент адносна ідэі кансалідацыі ўсіх нацыянальных чыннікаў на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага.

Менавіта таму літоўскі і беларускі нацыяналізм, хоць і непажаданы з пункту гледжання краёвай ідэалогіі, успрымаецца намі больш спакойна, бо мы верым, што непазбежная эвалюцыя грамадска-палітычных адносін у нашым краі мусіць у рэшце рэшт прывесці да змякчэння нацыянальных антаганізмаў і ўсталявання згоднага *modus vivendi,* у той час як польскі нацыяналізм больш шкодны, бо б'е па гістарычных традыцыях і падрывае тэрытарыяльныя асновы краёвасці.

Кажучы коратка: літоўская палітычная думка, а яшчэ ў большай ступені беларуская, увогуле яшчэ *не дарасла* да краёвай ідэалогіі, абапертай на традыцыях Вялікага Княства Літоўскага, у той час як польская (тутэйшая) палітычная думка пад уплывам нацыянальных сілаў, якія дзейнічаюць звонку, яе перарасла, а хутчэй непамерна і аднабакова збуяла. Такім чынам, адносна таго, што яшчэ толькі пускае парасткі, можна мець надзею на паступовае развіццё і набыванне натуральнай формы. Тое ж, што ўжо вырадзілася, можа вярнуцца ў нармальны стан толькі з цяжкасцю і пры вялікіх намаганнях.

Адным словам, краёвасць – гэта выразна тэрытарыяльная, а не нацыянальная канцэпцыя, і ўсе высновы пана Дрыгвіча па сутнасці з праблемай краёвасці не маюць нічога агульнага.